# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА

*Пачынальнікі*

## ПЯСНЯР "ВІЦЕБСКАЙ БЕЛАРУСІ" МІКАЛАЙ НІКІФАРОЎСКІ



17 мая гэтага года спаўняецца 170 гадоў з дня нараджэння выдатнага збіральніка і даследчыка фальклору, укладальніка зборнікаў фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага (1845 – 1910).

Звестак пра яго жыццёвы шлях і фальклярыстычную спадчыну даволі шмат дзякуючы, у першую чаргу, таму, што сам Мікалай Нікіфароўскі актыўна і творча пісаў, прычым не толькі навуковыя даследаванні, але і ўспаміны, і нарысы. Багатая таксама яго эпісталярная спадчына.

Увосень 1893 г. 48-гадовы настаўнік Нікіфароўскі з Віцебска, які ўжо заявіў пра сябе ў навуцы, адпраўляе ў рэдакцыю часопіса "Этнографическое обозрение" ўласную біяграфію. Рэдактар выдання Мікалай Янчук тады не апублікаваў яе, але яна захавалася ў архіве Інстытута этналогіі і антрапалогіі імя Міклухі-Маклая РАН. У канцы 1950-х гг. асобныя матэрыялы з яе былі выкарыстаны В. Бандарчыкам і І. Чыгрынавым пры напісанні кнігі "Николай Яковлевич Никифоровский: Очерк жизни и деятельности" (1960). Наступная манаграфія, прысвечаная М. Нікіфароўскаму, з'явілася праз трыццаць гадоў. У 1991 г. Галіна Пятроўская надрукавала працу "Пачынальнік беларускага народазнаўства М. Я. Нікіфароўскі", дзе створаны выразны і вельмі "чалавечы" партрэт збіральніка, цытуюцца яго лісты і ўспаміны. Сёння персаналія "Нікіфароўскі" займае сваё месца ў навуковых і даведачных выданнях па гісторыі айчыннай фальклярыстыкі і этнаграфіі сярод імёнаў класікаў беларускага народазнаўства. Спрабуючы даць абагульненне творчай спадчыны М. Нікіфароўскага, спынімся на асобных, найбольш істотных момантах.

Імя Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага павінна асацыявацца, на нашу думку, у першую чаргу, з вывучэннем традыцыйнай культуры Віцебшчыны. Віцебшчына – гэта яго калыска, месца станаўлення асобы, там яго сацыяльны вопыт, назапашаны не за настаўніцкай кафедрай, а на нялёгкіх шляхах даследчыка народнага жыцця.

Нарадзіўся М. Нікіфароўскі ў вёсцы Вымна Веліжскага павета (сёння Віцебскі раён) у беднай сям'і. Маці імкнулася даць дзецям пачатковую адукацыю, выдаткоўвала на гэта, як успамінаў потым славуты збіральнік, апошнія грошы. Першымі настаўнікамі хлопчыка былі выпадковыя людзі: адстаўны салдат, хросны бацька, пісьменны падлетак, манах, сельскі святар. Ён ідзе ў людзі праз царкоўную навуку: спявае ў архірэйскім хоры, паступае ў духоўнае вучылішча, потым у Віцебскую семінарыю. У семінарыі, пры падрыхтоўцы да духоўнага сану, малады М. Нікіфароўскі збірае матэрыялы для змагання, як гэта належыць святару, з перажыткамі паганства. У будучыні тое, з чым семінарыст хацеў змагацца, стане галоўным аб'ектам яго навуковага зацікаўлення і шчырага чалавечага захаплення.

У 1867 г. пачалася настаўніцкая дзейнасць М. Нікіфароўскага, што працягнецца 43 гады. Большую частку жыцця ён працаваў на невы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сокіх пасадах менавіта ў навучальных установах Віцебска.

Сціплы ў жыцці чалавек, сваю настаўніцкую місію М. Нікіфароўскі рэалізоўваў і тады, калі заахвочваў навучэнцаў да збірання фальклору. Тут варта нагадаць, што ён быў шматгадовым і вельмі плённым карэспандэнтам П. Шэйна і, відавочна, меў уласную сетку збіральнікаў. Менавіта яму ў значнай меры абавязаны сваёй папулярнасцю і навуковай каштоўнасцю фальклорна-этнаграфічныя зборнікі П. Шэйна. Дасланае М. Нікіфароўскім склала значную частку трох тамоў шэйнаўскіх "Матэрыялаў" (1887 – 1902), пра што падрабязна пісалі яшчэ ў пачатку XX ст. Я. Карскі і У. Стукаліч.

У пачатку 1990-х гг. М. Нікіфароўскі пазнаёміўся з Я. Карскім і неўзабаве актывізаваў самастойную даследчыцкую дзейнасць, практычна адразу пачынаюць выходзіць яго грунтоўныя працы.

Серыя нарысаў з сямі частак пад агульнай назвай "Нарысы Віцебскай Беларусі" (1892 – 1899) прысвечана сацыяльна-эканамічнаму становішчу і побытавай культуры розных груп насельніцтва Віцебшчыны (старцы, музыкі, паншчынныя сяляне, "пітушчыя і прапойцы" і інш.) у час прыгонніцтва. "Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку" (1895) – найбуйнейшае ў XIX ст. даследаванне матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці сялян Віцебшчыны. Яно ўключае апісанне народнай кулінарыі, традыцыйнага касцюма, характарыстыку земляробства, рамёстваў, промыслаў, прылад працы, тыпаў паселішчаў і гаспадарчых пабудоў. Капітальнай працай М. Нікіфароўскага стаў таксама зборнік "Простанародныя прыкметы і павер'і, прымхлівыя абрады і звычаі, легендарныя паданні пра асобы і мясціны" (1897), дзе апублікаваны больш за дзве тысячы фальклорных адзінак (прыкмет, павер'яў, забабонаў, абрадаў, звычаяў, апісанняў сродкаў народнай медыцыны і ветэрынарыі, а таксама аповедаў).

Белетрызаваныя нарысы "Нячысцікі. Збор простанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу" (1907) [1] – разгорнутае апісанне паходжання, іерархіі, лакалізацыі і функцый дэманічных істот. Здаецца, што аўтар кіраваўся жаданнем паказаць іх вялізную колькасць, разнастайнасць і ўсюдыіснасць. Гэты, створаны М. Нікіфароўскім і яго папярэднікам П. Шпілеўскім, своеасаблівы "персанажны код беларускай дэманалогіі" [2] сведчыць пра метадалагічную зададзенасць, сфарміраваную яшчэ ў працах міфалагічнага кірунку сярэдзіны XIX ст. Пасля смерці збіральніка ўбачыў свет першы буйны зборнік "Беларускія песні-частушкі" (1911), які змяшчае 2356 прыпевак, сабраных М. Нікіфароўскім і яго карэспандэнтамі з 1860 да 1905 г. Зварот да гэтага малога песеннага жанру – наватарская з'ява ў тагачаснай навуцы. Таксама палявыя матэрыялы М. Нікіфароўскага склалі выдадзеныя ўжо пасля смерці зборнікі "Напаўпрыказкі і напаўпрымаўкі, якія ўжываюцца ў Віцебскай Беларусі" (1910 – 1913) і "Напаўпрыказкі і напаўпрыслаўкі" (1928).

Навуковая дзейнасць М. Нікіфароўскага была вельмі плённай і самаадданай. Дзякуючы яго працам сёння мы маем багаты фактычны матэрыял пра многія з'явы традыцыйнай культуры Віцебшчыны: калядная гульня "Жаніцьба Цярэшкі"*, пахавальны абрад, галашэнні і сістэма дзён памінання продкаў, народна-медыцынскія практыкі, прыкметы, павер'і і засцерагальныя дзеянні, дэманалогія, загадкі, прыпеўкі і многае іншае. Сацыяльна-культурныя тыпы *дудара, музыкі, старца*, упершыню апісаныя даследчыкам, лічацца класікай беларускай этнаграфіі.

Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі быў "прадстаўніком сапраўднай нацыянальнай інтэлігенцыі, дзейнасць якой абумоўлівалася і была выклікана да жыцця ростам нацыянальнай свядомасці беларускага народа" [3]. Сёння, калі мы адзначаем 170-гадовы юбілей збіральніка, яго працы па фальклоры і этнаграфіі Віцебшчыны служаць не толькі каштоўнай крыніцай навуковых звестак, але і ўзорам высокага служэння ўласнаму народу.

**Спіс літаратуры**

1. **Никифоровский, Н. Я.** Нечистики : Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Изд. Н. А. Паньков, 1995. – 85 с.

2. **Чароўны свет** : з беларускіх міфаў, паданняў і казак / падрыхтоўка і каментаванне тэкстаў У. Васілевіч. – 2-е выд. – Мінск, 2010.

3. **Пятроўская, Г. А.** Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі / Г. А. Пятроўская // Беларуская фальклярыстыка : Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / пад рэд. А. С. Фядосіка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С. 203.

**Настасся ГУЛАК,**
старшы выкладчык
кафедры этналогіі і фальклору
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў,
кандыдат філалагічных навук.

* Сёння гульня "Жаніцьба Цярэшкі", зафіксаваная ў Лепельскім раёне Віцебскай вобласці, унесена ў Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прынятых пад ахову дзяржавы.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ